

# ПОЛЫМЯ

ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКІ
І ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫ ЧАСОПІС

12 (1142)

СНЕЖАНЬ 2024

Выдаецца
са снежня 1922 года

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь;
Грамадскае аб’яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі»;
Выдавецкае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства
«Мастацкая літаратура»

Намеснік дырэктара — галоўны рэдактар
Віктар Анатольевіч ШНІП

Рэдакцыйная калегія:

Лада АЛЕЙНІК, Уладзімір АНДРЫЕВІЧ,
Алесь БАДАК, Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ,
Уладзімір ГУСАКОЎ, Марыя ЗАХАРЭВІЧ,
Віктар ІЎЧАНКАЎ, Аляксандр КАВАЛЕНЯ,
Алесь КАРЛЮКЕВІЧ, Валерый МАКСІМОВІЧ,
Зоя МЕЛЬНІКАВА, Пётр НІКІЦЕНКА,
Віктар ПРАЎДЗІН, Зіновій ПРЫГОДЗІЧ,
Іван САВЕРЧАНКА (старшыня),
Уладзімір САЛАМАХА, Васіль СТАРЫЧОНАК,
Таццяна ШАМЯКІНА, Наталля ЯКАВЕНКА

Мінск
УП «Мастацкая літаратура»
2024

## ПАЭЗІЯ І ПРОЗА

**Міхась Пазнякоў.** Усё ў жыцці невыпадкова. *Вершы* 3
**Людміла Рублеўская.** Запавет Фаўста. *Раман алхімічна-філалагічны. Заканчэнне* 8
**Таццяна Барысюк.** Формула прыгажосці. *Вершы* 49
**Юлія Бармута.** Анёл Георгі. *Аповесць-прытча* 53
**Святлана Бельская.** Майго шчасця хвіліна. *Вершы* 63
**Вікторыя Сон.** На светлым палатне. *Вершы* 65

## ПЕРАКЛАДЫ

**Рысалат Хайдарава.** Гарачае лета ў Гургуртэпе. *З узбекскай. Пераклад Алеся Карлюкевіча* 67

## НАВУКОВЫЯ ПУБЛІКАЦЫІ

**Мікола Мікуліч.** «Чарнее на снегу істужка...». *Жыццёвы і творчы лёс Паўлюка Шукайлы* 93
**Аксана Бязлепкіна-Чарнякевіч.** Пісьменніцкая ініцыяцыя ў літаратурным працэсе Беларусі першай паловы XIX стагоддзя: філаматы, А. Міцкевіч, Я. Баршчэўскі 105

## КРЫТЫКА І ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА

**Аліна Сабуць.** «Жыві, мой верш, і сэрца грэй...»: чароўныя мелодыі паэзіі Марыі Шаўчонак 113

## УСПАМІНЫ

**Таццяна Шамякіна.** Савецкая моладзь у парадаксальныя 1960-я. *Заканчэнне* 122

## КНІГАРНЯ

**Міхась Сліва.** Па Божай сцяжыне — да новых дасягненняў 135

## ЗМЕСТ ЧАСОПІСА ЗА 2024 ГОД 137

16+

Аліна Сабуць

# «ЖЫВІ, МОЙ ВЕРШ, І СЭРЦА ГРЭЙ...»: ЧАРОЎНЫЯ МЕЛОДЫІ ПАЭЗІІ МАРЫІ ШАЎЧОНАК

Высокае слова. Каму яно трэба,
Каму немагчыма пражыць без яго?
Пра гэта пытаю высокае неба,
Пра гэта пытаю ў сумлення свайго.

*( «Высокае слова»)*

Лірычнай гераіні вершаў вядомай гродзенскай паэтэсы Марыі Шаўчонак, характэрнае надзвычай тонкае ўспрыняцце свету, душэўная замілаванасць жыццём як найбольшым Божым дарункам, шчырая любоў да мурожных прастораў зялёна-блакітнай Беларусі. Яе натхняе цяпло людскога ўзаемаразумення, высакародная веліч кахання, шыкоўныя, песенна-меладычныя чары мовы. Усё гэта, безумоўна, вывяраецца і вымяраецца ранімай душой паэтэсы, яе перажытым і пражытым, яе пачуццямі, якія няўлоўнымі тонамі пераліваюцца ў шматгалосым, неспазнавальным свеце. А свет гэты, сагрэты мяккімі акварэльнымі фарбамі і мажорна-светлымі тонамі, дорыць багатую палітру святла і красы кожнаму, хто ўмее здзіўляцца і захапляцца, любіць і кахаць,  цаніць і берагчы. І чытач багацее душой, смакуючы слодыч жыцця, поўнага таемных дзівосаў, далучаючыся да іх праз такія радкі, як: «восень загараецца рабінамі, // золатам бярозавых завей» [5, с. 108] і «на тоненькіх ножках пралескі // танцуюць пад гукі вясны» [5, с. 157], «якая радасная сіла // у юнай зелені бяроз!» [5, с. 87], або «сіняй птушкай ўзаўецца // сон-трава з глыбінь зямных» [5, с. 91]…

Але не толькі падобнай прыгажосцю аздабляюцца старонкі паэтычных кніг Марыі Шаўчонак. Прываблівае адкрытая лірычная спавядальнасць, поўная жыццятворных імпрэсій: «Як першы раз гляджу на свет, // Стаю затоена ў здзіўленні, // Запомніць трэба ўсё навек, // Сабраць, адчуць усе адценні» [6, с. 43]. Прываблівае шчырая вера ў добрае і вечнае: «У самае святое — чалавечнае. // Ва ўсё, што не хаваецца пад маскаю, // Што вабіць чысцінёй і сілай майскаю» [5, с. 123]… А таксама вера ў тую *белую ластаўку*, якая паклікала саму паэтэсу ў нязведаную далячынь Яе вялікасці паэзіі… З «Белай ластаўкі» (1971), яе першага паэтычнага зборніка з серыі «Першая кніга паэта», дзе адлюстравалася рамантычная захопленасць светам, светлая вера ў здзяйсненне запаветных мараў-надзей, якія прынясе *стралой чарадзейнай* на сваіх крылах менавіта яна, белая ластаўка, пачаўся шлях паэтэсы ў вялікую літаратуру. І ці не гэтае народнае павер’е стала творчым талісманам, азарэннем у благаслаўлёнай паэтычнай прасторы таленавітай, прызнанай пісьменніцы?

А магчыма, белую ластаўку ў блакіце неба ўбачыла дзесяцігадовая дзяўчынка-школьніца Марыя Шаўчонак, якая свой першы верш «Я піянерка» надрукавала ў 1954 годзе ў газеце «Піянер Беларусі», а пасля старшакласніцай прэзентавала свае вершы на старонцы часопіса «Бярозка». І мары-спадзяванні пачалі спраўджвацца… Бо ўбачыць белую ластаўку на золку жыццёвага шляху —

гэта ці не Божы знак, пакліканне?.. Яшчэ ў ранніх вершах лірычнай гераіні хацелася «ўзляцець // і птушкай плыць між зорак серабрыстых // … у падарожжа казачнае клікаць» [4, с. 18].

Пад крылом белай ластаўкі панавіта заявілі пра сябе ўсе сем (якая прыгожая, знакавая лічба!) лірычных зборнікаў Марыі Сіланцьеўны Шаўчонак: «Белая ластаўка» (1971), «Свята зямлі» (1976), «Бацькоўскае імя» (1981), «Раса-расінка» (1985), «Белыя свечкі каштанаў» (2005), «Искорка сердца» (2006), «Озёрная святыня» (2009). Паэзія Марыі Шаўчонак была заўважана аўтарытэтнымі творцамі, майстрамі паэтычнага слова, такімі як Ніл Гілевіч і Алег Лойка, Анатоль Грачанікаў і Алесь Звонак, Юрась Свірка і Міхась Хведаровіч, Алесь Марціновіч і Сяргей Кавалёў, Аляксей Пяткевіч і Юрка Голуб, Галіна Самойла і Тамара Мазур, Іван Пяшко і Сяргей Чыгрын і іншымі.

Марыя Шаўчонак — член Саюза пісьменнікаў Беларусі (з 1979 г.), лаўрэат прэміі імя А. І. Дубко Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта «За творчыя дасягненні ў галіне культуры і мастацтваў» у намінацыі «Пісьменнік года» (2005). Паэтэса шмат паспрыяла раскрыццю пісьменніцкіх здольнасцей сваіх малодшых калег па пяры, моладзі (заснавальніца і рэдактар літаратурна-мастацкага альманаха «Нябесны знак», ініцыятар аўтарскіх праграм «Слова», «Гарадніца» на гродзенскай студыі тэлебачання). Многія вершы Марыі Шаўчонак перакладзены на рускую (Рымай Казаковай, Анатолем Кулагіным, Фёдарам Яфімавым, Іосіфам Васілеўскім і інш.), латышскую, англійскую і іншыя мовы. На вершы паэтэсы напісана музыка кампазітарамі Л. Захлеўным, А. Маркелавым, І. Вераб'ёвым, М. Копам, І. Кузняцовым.

Музыка і слова суладна адлюстроўваюць душу паэтэсы. Прыслухаемся:

У кожнай кветкі музыка свая,
Свой зорны час, свой колер гэтаксама.
Ці не таму і ў песнях салаўя
Адценняў розных пераліўных гама.
Яна агнём як быццам апячэ,
Прасветленай удзячнасцю зайграе,
І перад ёй яшчэ раз і яшчэ
Прыціхне ўся сама зямля жывая.
<. . .>
...Усё, што любіш і ўсё, чым жывеш,
Мелодыяй здаецца недапетай [5, с. 22].

*(«У кожнай кветкі музыка свая»)*

Высокая місія кожнага творцы — абудзіць пачуцці чытача, ускалыхнуць душу так, пасля чаго захочацца перайначыць свет да лепшага, асвятліць яго, сагрэць сваёй душой... Зусім невыпадкова знакаміты гродзенскі літаратуразнаўца, прафесар Аляксей Пяткевіч назваў творчасць Марыі Шаўчонак так гожа і велічна: паэзія пачуцця [2, с. 139]. І — пазней — удакладніў: «Паэтка эмацыянальна адкрытага светаадчування, яна ўмее адгукацца на ўсё светлае і прыгожае. Надзеі і мары, каханне, вясна, чысціня сэрца, вернасць роднай зямлі — тыя пласты жыцця, якія найлепш увасабляюцца яе мастацкім словам» [3, с. 114]. Бо менавіта музыка душы нараджае яе слоўцы, якія сыходзяць шчыра, непасрэдна ад сэрца, каб «...толькі ва ўсім быць прыгожай» [5, с. 40]. Яшчэ зусім маладая, акрыленая небаўзлётнымі марамі, паэтэса так даверліва сказала: «Шчаслівая, музыкай сёння жыву, // Святло напаўняе душу, // На хвалях мелодыі ўдалеч плыву» [5, с. 134] («Шчаслівая, музыкай сёння жыву»). Плынь жыцця, асветленая святамі і азмрочаная нягодамі, надае мудрасці лірычнай

гераіні, якая ўмеее адчуваць поўную гаму летуценнасці і паўсядзённасці, «як мільёны званочкаў не ведаюць слоў»:

На клавішы спускаю рукі,
Як быццам лодку на ваду.
Удаль плыву па моры гукаў
І іншых за сабой вяду.

Паслухайце.
У ноце кожнай
Не толькі радасці напеў.
У ёй успыхваюць трывожна
Адчай і горыч, боль і гнеў [5, с. 154—155].

*(«На клавішы спускаю рукі»)*

Музыка гучыць паўсюль: і ў таямнічай маўклівасці лесу, і ў танюсенька-тонкіх галасах жытніх каласоў, «таму што спявае любоў». Любоў да ўсяго жывога, роднага, любага сэрцу. І гэтае шчымлівае прызнанне ў любові да зямлі не робіць паэзію прыземленай, а, наадварот, узвышае яе, універсалізуе зямное прыцягненне як нешта непераўзыдзенае, нават сакральнае: «І да Зямлі сваёй любоў // Мацней любога пачуцця» [5, с. 135] («Яшчэ з дзяцінства знаю я»). Бо «спяваюць голасам зямлі» ў адначассе «жывыя дні, жывыя людзі» — і паўстае перад чытачом вабны райскі прыстанак з адухоўленымі галасамі:

Там галасы травы і лесу,
Там галасы вясны і лета.
Там дарагія галасы,
Якая песня імі спета,
Якога шчасця адрасы! [5, с. 95]

*(«Адрасы шчасця»)*

Зямлі жыццятворная «напеўная гаючасць» адчувальная ва ўсім, таму паэтэса заклікае чытача пачуць нячутнае, невыказнае: «асенне-задымлены спеў верасоў // не кожны пачуе, напэўна» [5, с. 71], «прыйдзі, прыпыніся, уважлівей глянь // на гаму асенняга бору» [5, с. 71], «а спеў верасовы — як вечнасці спеў, // як подых жывога цвіцення» [5 с. 71]... І — ліецца музыка напоўніцу ў восеньска-вясновым карагодзе, бо ці не «з садовай замеці» паэтычны ўзлёт, акрыленасць паэтэсы:

Іграй, іграй, мой белы май,
І музыкай, і словамі.
Не замаўкай, не ападай
Пялёсткамі вішнёвымі [5, с. 111].

*(«Белы май»)*

Трапяткая душа паэтэсы адчувае сябе боганатхнёна ў першародным прыродным наваколлі, адкуль выкрасаецца на дзіва мудрая выснова:

Уся прырода — творчасць Бога, —
Чаруе лета і зіма.
Няма тут лішняга нічога
І непатрэбнага няма [5, с. 25].

*(«Уся прырода — творчасць Бога»)*

Здзіўляцца кожнай пейзажнай праяве і ўмець захапіць гэтым і чытача — рэдкі дар творцы. Марыя Шаўчонак мае гэты дар, пасланы з нябёсаў, бо пра «высокае слова» яна пытаецца ў «высокага неба», «у сумлення свайго», бо душа штодня просіць кожнае новае ранне перанесці «ў задумлівыя струны, // у чаруючыя фарбы, // у жывое вечна слова» [5, с. 148]. Прыгледзімся да гэтага магічнага чарадзейства, якое ажыўляе, выпраменьвае глыбінную сутнасць каштоўнасці жыцця:

Колькі тонкага водару ў кожным пялёстку,
А рамонкі бялюткія — сімвал надзей... [15 с. 43]

*( «Колькі тонкага водару ў кожным пялёстку»)*

Або:

О, колькі ў цябе адценняў, неба,
О, колькі ў цябе колераў, любоў! [5, с. 87]

*(«Я ўсё не тое гавару, што трэба»)*

Тры класічныя модусы мастацкасці — дабро, ісціна і прыгажосць — (а перадусім любоў!) знітаваны ў чароўным, па-летняму сонечным вершы «Абуджэнне»:

Яшчэ не выказана радасць
У ранняй песні жаўрука,
Адну з найлепшых сваіх раніц
Сустрэла летняя рака.
Ёй сёння верыцца бясконца
У чары ціхіх чабароў.
Зямля заўсёды верыць сонцу,
Як сэрцу верыцца ў любоў [5, с. 62—63].

Сапраўдная паэзія творыцца не толькі фарбамі і гукамі, якія па-майстэрску пераносяцца на паперу ў роўненькія радкі. Надзвычай далікатна, па-жаночы ўсхвалявана, з адчуваннем унікальнасці жыцця Марыя Шаўчонак «выбірае не адценні, // а пераносіць іх напеў: // то неба ў зоркавым мігценні, // то радасць сонца ў кронах дрэў» [6, с. 9] («Шлях мастака»). Зарукай таму — гармонія светаўспрыняцця («не раз квітнела ў лузе летам, // лятала ў вырай колькі год. // шумела коласам на полі, // была сястрычкаю бяроз» [5, с. 149]), вера ў жыватворную моц зямлі, якая «адгукаецца новаю песняй»:

Таму з адказнасцю двайною
Рабіць павінна кожны крок.
Каб ні зямля, ні ўсё жывое
Ні ў чым не кінулі папрок [5, с. 149].

*(«Я ўсім была на свеце гэтым»)*

У майстэрні мастацкага слова Марыі Шаўчонак сапраўды раскошна: тут прасторна і маляўніча, летуценна і меладычна. Паэтэса прагна шукае няўлоўныя гукі і фарбы, наталяецца вобразамі роднай зямлі, знітаванымі з паняццямі роду, радзіны, Радзімы — сакральнымі па сваёй сутнасці з'явамі. Нельга не пагадзіцца са словамі вядомага сучаснага літаратурнага крытыка Алеся Марціновіча, які слушна адзначыў, што творчасць Марыі Шаўчонак — «тая традыцыйная паэзія, якая моцная сваёй жыццёвай асновай» [1, с. 7]. Трапят-

кая душа паэтэсы, якая «не шукала лягчэйшых сцежак і дарог», мроіць «пра вечнае, пра самае святое» — застацца сабою, «быць іскрынкай, але не згасаць»; «Зачараваная зямлёй зялёна-сіняю, // На ёй хачу я белай кветкай быць [5, с. 41] («Мелодыі лета»).

Асаблівым святлом пранізаны вершы-прысвячэнні любаму сэрцу каралеўскаму гораду Гродна, які прытуліў палка-рамантычную паэтэсу на ўсё свядомае дарослае жыццё: «Бо тут, на нёманскай вадзе, // Вянком купальскім — мая доля» [5, с. 46] («Тры ракі»). Менавіта тут ззяе яе паэтычная зорка, падобна як запаленая ў горадзе дзяцінства зорка беларускага класіка Максіма Багдановіча:

Матыльком сінякрылым над белымі вішнямі
Прамільгнула Максіма святая душа.
Недарэмна яна ўзята сіламі вышнімі,
Недарэмна так рана ад нас адышла.
<. . .>
Але шэпча яна: «Я жыву, не скаруся!»
... Я Максімаву бачу душу над сабой.
Паглядзіце ж: паўсюды, на ўсёй Беларусі
Гэтак многа паэтаў, як кветак вясной [5, с. 35].

*(«Максіму Багдановічу»)*

Прачула, глыбінна-сутнасна намаляваны вобразы сівой Каложы, якая «ўсё гэтак жа прыгожа» імкнецца «гордая, угору»; гарадзенскіх вуліц, вабных незабыўнай, чароўнай квеценню «белых свечак каштанаў»; паўнаводнага шумнацечнага Нёмана.

А Нёман вечна малады,
А Нёман больш, чым проста Нёман.
Тут столькі тайны векавой,
Тут столькі мудрасці спрадвечнай! [5, с. 35]

У велічнай «Песні пра Гродна» Марыя Шаўчонак адрасуе запаветныя радкі гарадзенцам і іх нашчадкам: «Нам цябе шанаваць, // Нам цябе праслаўляць, // Ты любоўю і славай азораны» [5, с. 7]. Ці не таму горад Гродна — «горад родны, ... // горад самы старажытны, // горад самы малады» [5, с. 7]. Знакавай візітоўкай горада служаць пранікнёныя радкі верша з адметна характарыстычнай назвай «Белыя свечкі каштанаў»:

Белыя свечкі каштанаў
Па-над Гародняй ізноў.
Я гаварыць з імі стану
Толькі ўвесь час пра любоў.
<. . .>
Гродна, мой горад любімы,
Колькі ў табе хараства!
Славяць званы тваё імя
Музыкай светлай Хрыста [5, с. 8].

Ад гарадзенскай «краіны замкаў» Марыя Шаўчонак штораз вяртаецца да акружанай лесам невялічкай старадаўняй вёскі Новы Востраў на Магілёўшчыне, дзе паэтэса нарадзілася, дзе ўсё світальна, зорна, свяшчэнна, дзе край азораны «святлом душы, святлом бяроз». У вершы «Маё, найлепшае на свеце» аўтарка

малюе святочна-дзівосны свет сваёй малой радзімы, якая ўдыхнула ў яе самадастатковасць і годнасць, душэўнасць і вернасць:

Доўгачаканая сустрэча!
Як вочы лета — васількі,
Як рукі сябра — цёплы вецер,
Як песня маці — спеў ракі.
На кожнай сцежцы тут — па ўсмешцы,
На кожным кроку тут — паклон.
Усё сваё мне ў гэтым месцы,
І я свая ўсім з даўніх дзён.
Маё, найлепшае на свеце,
Дзе ўсе змяшаліся часы.
У іх дзяцінства промні свецяць,
У іх юнацтва галасы.

Ці не таму з дарогі кожнай
Нас кліча гэтак родны край,
Якому з нас ніхто не зможа
Сказаць апошняе «бывай» [5, с. 89-90].

Прыгожымі россыпамі зіхацяць успаміны пра краіну маленства і юнацтва, бо менавіта тут — багавейны сакрэт адчування музыкі слова, яго водару: «Слова простае, нечаканае, // Чыстым золатам адчаканена» [5, с. 51]. Словы — «споведзь і сляза» — чароўнымі гукамі пераліваюцца і ў песні, або, як прызнаецца сама паэтэса, «я сама была // неразлучнаю з песняй» [5, с. 47] («Не пакіну слядоў»), «мне песня тым крылом // служыла, як магла» [5, с. 72] («Крыло маё — песня»).

Ці не ад беларускай спеўнай прасоды, моцы бацькавага імя («Ці не таму ад слова «сіла» // Маё бацькоўскае імя…?» [5, с. 78] («Бацькоўскае імя»)), мацярынскай навукі і спрадвечна ўпарадкаванага вясковага быцця зарунела яе непадробнае паэтычнае красамоўе?.. Тут ёсць свой абярэг, «шчасця і мары выток»: «Тут даецца слову // Сіла, навіна. // Тут мае вытокі // Шчасця, дабрыні. // У мудрасці глыбокай — // Продкаў карані» [5, с. 86] («Вытокі»). Край гэты для паэтэсы — сапраўдны Рай: «Край няспраўджаных мар, // Край сляпых летуценняў!.. // Самы светлы мой сон, // дзе ўладарыць таемнасць» [5, с. 106] («Успамін»): менавіта тут валадарыць жывая святламузыка, тут «мелодыі блакітныя нябёс» і «льецца песня, як ручай»; тут яна змалку зачараваная «дрымотнай печчу» і чырванню маразоў, «косамі белых родных бяроз»; гэта тут «чабор і бярозкі, // і сосны да самай вёскі» — і таму адсюль найдаражэйшы «ў канверце з роднай бярозы лісток»… Самавіта, узнёсла гучыць шчадрадайная споведзь удзячнай дачкі свайго краю перад спадчыннай святыняй:

Мой Новы Востраў, мілы астравок,
Майго дзяцінства родная калыска!
У сэрцы твой нязгасны вугалёк,
І ты на ўсёй зямлі мне самы блізкі [5, с. 77].

*(«Мой Новы Востраў, мілы астравок»)*

З гэтага непаўторнага казачнага свету дзяцінства «ўпершыню адкрылася // яснасць даляў і вялікіх мэт» [5, с. 132], неадольнае жаданне ўвасобіцца ў празрыстай «расе-расінцы», каб «у сабе змясціць планету» і наталяцца «роснымі пялёсткамі» кветак, бо толькі «сярод кветак і травы // такое сонечнае неба!»

Гэта і светлае прычашчэнне перад вясковым светам: бацькамі, суседзямі, землякамі. Душа паэтэсы саграваецца ад пашаны і прызнання:

Без вас і зямля не была б, як Зямля [5, с. 75].
(*«Зноў восень...»*)

Так, з басаногага маленства, дзе «ў кожным дрэве і траве // ёсць памяць продкаў векавая», пачынаецца Радзіма. З усведамлення сваёй прыналежнасці да кожнай драбніцы зямнога свету. «Зямная» — апазнавальная, адметная рыса партрэту тады яшчэ зусім юнай паэтэсы, якая годна, з урачыстым хваляваннем, але так нязмушана і запаветна прамовіць:

Магчыма, мяне спытаюць,
Адкуль я і хто такая?
З гонарам найвялікшым
Я адкажу: «Зямная!
Глядзіце — мая Радзіма!..
Я сцежкай вунь той хадзіла.
Як радасць, за возерам сінім
Вёсны страчала і зімы...» [4, с. 11].
( *«Зямная»*)

У паэзіі Марыі Шаўчонак узнёсла паэтызуецца вобраз Беларусі. Страснае паэтычнае слова, без пафасу і напышлівасці, адрасавана адзінаму роднаму беларускаму краю, дзе любыя сэрцу «і лес прырэчны», і «гай знаёмы, быццам песня», і «сімвал роднага краю, васілёк сінявокі». Сакральны культ Радзімы ўвасабляецца ў вечнасці — і трапяткое гучанне набываюць сцвярджальныя радкі: «І мне здаецца — я тут вечна, // Як сонца, неба і зямля» [5, с. 133] («У Беларусь буслы прынеслі»). Паэтычная Муза Марыі Шаўчонак адухоўлена гаючым бальзамам спавядальнай вернасці той зямлі, «якую клічуць Руссю Белаю, што тут дзяды мае жылі». У вершы «Мая Радзіма» чытаем:

Яна мне дадзена адзіная
На ўсё жыццё, на цэлы век.
Мая адзіная, радзімая
Ў вянках лясоў і стужках рэк.
Заўсёды самая прыветная,
Як сонца, свеціцца сама,
Жыве, як мара запаветная,
І роўных ёй — нідзе няма [5, с. 77].

І гэта не толькі захапленне маляўнічымі беларускімі краявідамі, але і шчыры клопат пра будучыню сваёй Бацькаўшчыны. Адраджэнска-духоўным патрыятычным пафасам напоўнены ўсхвалявана-спавядальныя запаветныя радкі верша «Мой боль — Беларусь»:

Беларусь пражыве і без нас,
Беларусь пражыве і без вас,
Але вы без яе — пражывіце!
Адарваным лістком на зямлю
Ападзе без яе маё сэрца,
І баюся, што слова «люблю»
Непачутае ёй застанецца [5, с. 16].

Інтымна-філасофская паэзія Марыі Шаўчонак прасякнута дамінантамі душы, любові і святла, якія валадараць у бязмежным, часам няўтульным свеце. Пад гэтым чароўным трохзор'ем — выратавальнае суладдзе думак і пачуццяў, своеасаблівы бой з сабой: «*І ўсё ж іду я ў новы бой // За права быць самой сабой*» [5, с. 155] («Ты кажаш — быць самой сабой»)... Мабыць, тут ёсць пэўны перазоў з матывамі паэзіі Яўгеніі Янішчыц (паэтэсы былі знаёмыя), якая ёміста-афарыстычна акрэсліла псіхалогію жанчыны-паэтэсы: «*у паэтэс лірычнае адзенне*». Так, шыкоўным апафеозам каханню ў Марыі Шаўчонак можна назваць верш «Чатыры словы — злітак залаты»:

Чатыры словы — злітак залаты:
Кахаю,
          веру,
                    помню і чакаю.
Ёсць толькі словы гэтыя і ты.
І — ні адлегласці,
                    ні часу,
                              ні адчаю [5, с. 138—139].

Малітоўна-святое аблічча набывае ў творчасці Марыі Шаўчонак свяшчэнны вобраз Маці. Адзін з лірычных зборнікаў («Озёрная святыня», 2009) прысвечаны светлай памяці маці Паліны Рыгораўны Шаблінскай-Шаўчонак, якая была і застаецца для паэтэсы «*светам і цэлым сусветам, // сонцам і першаю зоркай*» («Вершы пра маму»). Матчыны песні для паэтэсы — найдаражэйшы скарб, «*радней ад раднейшых*», бо «*душу напаўняюць, як штосьці святое, // там словы — як песні, а песні — як сны*» [5, с. 31]. У вершы «Маме» — глыбокая падзяка за дар адчуваць слова, за тыя любыя сэрцу душэўныя беларускія песні, якія наталяюць у жыцці, адухаўляюць усё зямное:

Яны — найсвяцейшая памяць аб маме
І лепшае ўсё, што трымае зямлю [5, с. 32].

Ці не ад маці, яе светлай душы і шчырай малітвы, і вера ў Бога? Зварот да Боскага сярод жыццёвага тлуму — гэта заўсёднае імкненне спасцігнуць вялікую тайну, сэнс усяго існага. Для Марыі Шаўчонак як творцы гэта і шлях ўласнага самапазнання. Хрысціянская духоўнасць паэтэсы відавочная ва ўдзячнай любові да Бога:

Тваю ласку бясконцую, Божа,
Твайго зорнага космасу ніць
Толькі сэрцам прасветленым можна
І адчуць, і навек палюбіць [5, с. 11].

*(«Прасветленасць»)*

У імклівым, паклічным пошуку свайго «Я» хаваецца няўтольная прага да высакароднага, духоўнага, жаданне лірычнай гераіні самавыявіцца:

Ёсць імгненні душы...
Ці душа ў тых імгненнях,
Калі поўняць яе чысціня вышыні
І святло! — Аж да самага да асляплення
Невыказных праменняў святыя агні [5, с. 23].

*( «Ёсць імгненні душы...»)*

Стыль пісьма Марыі Шаўчонак класічны, матываваны нязмушанай, шчырай любоўю да зямлі, сонца, кветак і жыцця. Таму ў яе паэтычнай філасофіі гучаць мажорныя, святланосныя інтанацыі. Душа паэтэсы напоўнена любоўю, якая *«мой светач, маё багацце»* і *«пачатак бярэ ад маці, // а блаславенне — ад Божых рук»* [5, с. 76]. Такая любоў ачышчальная:

А я хачу, каб мяне любілі
Зямля і неба, сонца і дождж.
Ісці насустрач усім нягодам
І ўсіх спаткаць іх, нібы сяброў,
Са мною побач — мой год за годам,
Са мною ў сэрцы мая любоў *[5, с. 76].*

*( «Шумелі ліўні, маланкі білі»)*

Натуральна, паэзія Марыі Шаўчонак сілкуецца, сярод іншых крыніц, і народнапесеннымі матывамі. Суладдзе аўтарскага і народнапесеннага характарызуе вершаваны радок паэтэсы. Напрыклад, вобразы каліны, рабіны, бярозы як увасабленне жаночай долі з народных песень прысутнічаюць у многіх вершах паэтэсы («Каліна», «За лясамі чабаровымі», «Бяроза з крыжам на бяросце», «Бяроза», «Алеся», «Ты скажы мне, шчырая рабіна», «Побач з пшаніцай пасеялі лён» і інш.).

Паэзіі Марыі Шаўчонак уласцівыя афарыстычнасць, філасофскі лаканізм: «Свет трымае толькі дабрыня» [5, с. 39], «У кожнай кветкі музыка свая» [5, с. 22], «Уся прырода — творчасць Бога» [5, с. 25], «Жанчыны — нібы кветкі гожым днём» [5, с. 36], «Зноў і зноў прастаце зайздрошчу, — // Простай гэтак не проста быць» [5, с. 154], «Каханню гэтак неабходна вернасць, // Як сонца надыходзячай вясне» [5, с. 98] і інш.

Зайздросная грань таленту паэтэсы — неадольнае імкненне да гармоніі, непарушнасці светабудовы, урэшце, да святла. У вершы «Вяртанне» яна прызнаецца: «Я вяртаюся зноў да сябе, // Па драбнічцы сябе зноў збіраю» [5, с. 11]. Творчае крэда паэтэсы — «каб толькі ва ўсім быць прыгожай» [5, с. 40]. Размова тут ідзе, канечне, пра *сапраўдную* прыгажосць.

Пісаць душой і сэрцам дадзена не кожнаму. Марыі Шаўчонак наканавана, на нябёсах прапісана «не затушыць таго святла, // якім сама калісь была» [5, с. 148]. Храм яе высокай і натхнёнай Паэзіі поўны святла. Чулыя душою чытачы будуць заўсёды, нібы матылькі, ляцець на гэтае ззянне.

## Спіс літаратуры:

1. Марціновіч, А. Кропля расы і Сусвет / А. Марціновіч // Літаратура і мастацтва. — 2008. — 18 ліп. — С. 7.

2. Пяткевіч, А. М. Паэзія пачуцця // Пяткевіч, А. М. Старонкі спадчыны : культурнае памежжа Гродзеншчыны: працэсы, з'явы, асобы / Аляксей Пяткевіч. — Мінск : Бел. кнігазбор, 2006. — 240 с.

3. Пяткевіч, А. М. Слова і кніга Прынёмання : зборнік навуковых артыкулаў / А. М. Пяткевіч. — Гродна : ЮрСаПрынт, 2016. — 208 с.

4. Шаўчонак, М. Белая ластаўка : вершы / М. Шаўчонак. — Мінск : Беларусь, 1971. — 48 с.

5. Шаўчонак, М. С. Белыя свечкі каштанаў : вершы / Марыя Шаўчонак. — Слонім : Слоним. тип., 2005. — 168 с.

6. Шаўчонак, М. Раса-расінка : вершы / М. Шаўчонак. — Мінск : Маст. літ., 1985. — 70 с.